**САРАЧЫ́НЫ**, Саракавіны, Саракі, памінальны абрад, які адзначаецца на саракавы дзень пасля смерці чалавека. Згодна з нар. павер'ямі, душа нябожчыка перад тым, як адляцець на неба, наведвала родную сядзібу. У гэты дзень хату прыбіралі ручнікамі, за акно выстаўлялі хлеб-соль і шклянку з вадою. На С. родныя наведвалі магілу памерлага, наладжвалі ў доме жалобны стол, які паходзіць ад старажытнай язычніцкай трызны. Сярод абавязковых памінальных страў былі *куцця*, *канун* і інш. Асобны прыбор з пітвом і страваю ставілі для памерлага. С., як і інш. памінкі, звязаны з *культам продкаў*. Неабходнасць адзначаць С. тлумачылі тым, што непамянутая душа асуджана на пакуты і не будзе спрыяць людзям у іх зямных справах.

*Літ.*: Пахаванні. Памінкі. Галашэнні. Мн., 1986.

*У. А. Васілевіч.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ